# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі Гаршкова Аляксандра Дзмітрыевіча
**“Культура броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана: засяленне, храналогія, матэрыяльная культура”,**
якая прадстаўлена на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.06 – археалогія

Актуальнасць тэмы дысертацыйнага даследавання вызначаецца тым, што культура броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана не была прадметам спецыяльнага вывучэння ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. У беларускай гістарыяграфіі матэрыялы папуляцыі броме ў Заходнебугска-Прыпяцка-Нёманскім міжрэччы пачалі вылучаць у 60-я гг. XX ст. Аднак да 90-х гг. XX ст. дадзеная археалагічная культура ў беларускай гістарыяграфіі не разглядалася і ўзгадвалася ў акадэмічных і манаграфічных выданнях у кантэксце ўсіх старажытнасцей каменнага веку на тэрыторыі Беларусі.

У аўтарэфераце мэта і задачы даследавання сфармуляваны дакладна і лагічна. У якасці аб`екта вывучэння выступае фінальны палеаліт на тэрыторыі Беларусі. Прадметам даследавання з’яўляецца эвалюцыя культуры броме на тэрыторыі Заходнебугска-Прыпяцка-Нёманскага міжрэчча. З прапанаванымі фармулёўкамі аб`екта і прадмета можна пагадзіцца, паколькі яны адпавядаюць заяўленай тэме. Для паспяховага вырашэння пастаўленых задач у працы выкарыстоўваліся прынцыпы гістарычнага пазнання (гістарызм і аб’ектыўнасць), агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны, перажыткаў, палявых даследаванняў, эксперымента, стратыграфічны, рэмантажу, картаграфіі) метады. У сувязі з спецыфікай вывучэння гісторыі першабытнага перыяду, аўтарам выкарыстоўваліся сучасныя метады прыродазнаўчых навук. Гэта дазволіла аўтару распрацаваць тыпалогію паселішчаў і класіфікацыю прыладаў працы, вызначыць храналогію культуры.

Згодна аўтарэферату, дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох раздзелаў, заключэння, спісу выкарыстаных крыніц (284 пазіцый). Палажэнні, што прапануюцца да абароны, лагічныя, паслядоўныя, адпавядаюць пастаўленым задачам і абгрунтаваны самім даследаваннем. Асноўны змест дысертацыі, што падаецца ў аўтарэфераце, дае добрае ўяўленне аб зробленай працы, раскрывае пастаўленыя задачы і вырашае заяўленую мэту. Сфармуляваныя ў заключэнні высновы дакладныя, пераканальныя і не выклікаюць пярэчанняў.

З аўтарэферата саіскальніка А.Д. Гаршкова вынікае, што дысертацыя “Культура броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана: засяленне, храналогія, матэрыяльная культура”, з`яўляецца самастойным навуковым даследаваннем. Дысертант упершыню ў беларускай гістарыяграфіі раскрыў працэс фарміравання і развіцця археалагічнай культуры броме на тэрыторыі Беларусі. Саіскальнікам вызначаны ўплыў прыродна-кліматычных умоў на

ступень засялення, выяўлены прычыны з'яўлення культуры броме і яе гістарычны лёс на даследуемай тэрыторыі, раскрыта спецыфіка гаспадарча-культурнага тыпу паляўнічых-збіральнікаў. У дысертацыі дана характарыстыка гаспадарча-бытавых комплексаў і іх структурных адзінак. Для вызначэння функцыянальнай прыналежнасці элементаў кідальнага ўзбраення А.Д. Гаршкоў упершыню прымяніў метады матэматычнай карэляцыі колькасных паказчыкаў і TSCA–аналіз (вылічэнне плошчы папярочнага сячэння). У дысертацыі праведзены параўнаўчы аналіз матэрыялаў, характэрных для культуры броме, якія паходзяць з міжрэчча Заходняга Буга, Прыпяці, Нёмана і асноўнага арэала распаўсюджвання дадзенай культурнай адзінкі.

Вынікі даследавання прайшлі апрабацыю на 20 навукова-практычных канферэнцыях у Беларусі і Расіі і адлюстраваны ў 27 публікацыях у навуковых зборніках і матэрыялах канферэнцый агульным аб`ёмам 13 аўтарскіх аркушаў, у тым ліку ў 10 артыкулах у адпаведнасці з пунктам 18 Палажэння ВАК.

Матэрыялы і палажэнні дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы падручнікаў, лекцый і спецкурсаў па гісторыі і археалогіі Беларусі і Усходняй Еўропы ў вышэйшых навучальных установах. Палажэнні і высновы дысертацыі могуць быць запатрабаваны для навукова-асветніцкай дзейнасці ў музеезнаўстве, распрацоўцы турыстычных маршрутаў.

Аўтарэферат дысертацыі Гаршкова Аляксандра Дзмітрыевіча "Культура броме ў міжрэччы Заходняга Буга, Прыпяці і Нёмана: засяленне, храналогія, матэрыяльная культура", якая прадстаўлена на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.06 – археалогія, адпавядае патрабаванням ВАК, даследаванне ўносіць значны ўклад у айчынную археалагічную навуку, а саіскальнік заслугоўвае прысуджэння навуковай ступені кандыдата гістарычных навук.

Водзыў абмеркаваны і зацверджаны на пасяджэнні кафедры гісторыі славянскіх народаў УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна". Пратакол № 8 ад 30 красавіка 2024 г.

Даю згоду на размяшчэнне майго водзыва на аўтарэферат Гаршкова Аляксандра Дзмітрыевіча на сайце ўстановы «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова».

Дацэнт кафедры гісторыі славянскіх
народаў УА "Брэсцкі дзяржаўны
ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна",
доктар гістарычных навук, дацэнт А. А. Башкоў

Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
АДДЗЕЛ КАДРАЎ

Подпіс Башкова А.А. зацвярджаю
Нач. АК БрДУ ..................